эканамічным становішчам дзяржавы, процілегласцю паміж шырокім профілем навучання і спецыялізацыямі, не выклікае сумненняў.

2. Сярод канцэптуальных падыходаў удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў - бесперапынная адукацыя (БА). Вытокі БА даследчыкі знаходзяць у далёкім мінулым. У цэласным выглядзе канцэпцыя была прадстаўлена на форум ЮНЕСКА ў 1965 г. П.Ленграндам, буйнейшым тэарэтыкам БА. Галоўная ідэя - ставіць у цэнтр усіх адукацыйных пачынанняў чалавека, якому неабходна стварыць аптымальныя умовы для поўнага развіцця яго здольнасцей на працягу ўсяго жыцця.

3. Сістэма бесперапыннай прафесійнай адукацыі бібліятэкараў-бібліёграфаў уключае:
- прафесійны адбор;
- падрыхтоўку спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі;
- падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай адукацыі і навукова-педагагічных кадраў;
- павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку спецыялістаў.

Галоўнае - стварыць пераемнасць, стыкоўку этапаў у адпаведнасці з сучаснымі задачамі.

4. Арганізацыя БА бібліятэкараў-бібліёграфаў у нашым універсітэце вырашаецца па наступных напрамках:
- распрацоўка і ажыццяўленне вучэбнага плана са скарочаным тэрмінам навучання для атрымаўшых сярэднюю спецыяльную адукацыю;
- стварэнне навукова-вучэбнага комплексу "Беларускі універсітэт культуры - лінгвагуманітарны каледж", разлічанага на падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці "мэнеджэр інфармацыі бізнесу і бібліятэчнай справы";
- рэарганізацыя Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума ў Магілёўскі бібліятэчны каледж, які будзе ажыццяўляць падрыхтоўку па двух узроўнях (спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй і спецыялісту з паглыбленай сярэдняй адукацыяй).

5. У выніку вышэйзначанага і неабходнасці ўзнавіць, падняць на новы ўзровень работу па прафесійнай арыентацыі і ў сувязі з неабходнасцю пераходу да двухузроўневай сістэмы падрыхтоўкі ўзнікае патрэба распрацоўкі новых вучэбных планаў, праграм дысцыплін, падручнікаў, іншай метадычнай дакументацыі.

6. Першачарговымі мерапрыемствамі факультэта з'яўляюцца наступныя. Распрацоўка трох вучэбных планаў. Першы, з 5-гадовым тэрмінам навучання, для студэнтаў, якія залічаны ва універсітэт пасля сярэдняй школы, павінен прадугледжваць падрыхтоўку спецыялістаў двух узроўняў - бакалаўра і магістра.

Два другіх планы (для выпускнікоў лінгвагуманітарнага каледжа і Магілёўскага бібліятэчнага каледжа) таксама двухузроўневыя, але са скарочаным тэрмінам навучання. Прычым, на наш погляд, на апошняй (магістэрскай) ступені для кожнага студэнта распрацоўваецца індывідуальны план.

7. Самай пільнай увагі патрабуе этап, звязаны з паслядыпломнай адукацыяй спецыялістаў. На нашу думку, у складзе універсітэта тэрмінова неабходна стварыць інстытут павышэння кваліфікацыі. Зразумела, што бібліятэкары будуць павышаць кваліфікацыю на адпаведным факультэце гэтага інстытута.

8. Тэрмінова стварыць прафесійны часопіс, на старонках якога адлюстроўваліся б навукова-даследчыя, метадычныя і іншыя напрамкі дзейнасці спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы.

Платоненка Л.Ф.,
нам.дырэктара па навучальнай рабоце
Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума

## РЭФАРМАВАННЕ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ Ў МАГІЛЁЎСКІМ БІБЛІЯТЭЧНЫМ ТЭХНІКУМЕ ВА ЎМОВАХ ПЕРАХОДУ ДА ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ СІСТЭМЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Працэс удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу ў тэхнікуме пачаўся з абнаўлення зместу адукацыі па спецыяльнасці Г 01.02 "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" на падставе нацыянальнага аспекту дэідэалагізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэты працэс прадугледжвае пераасэнсаванне зместу вучэбных дысцыплін, напаўненне іх нацыянальным зместам, улік асноўных напрамкаў як агульнай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі - гуманізацыі і гуманітарызацыі працэсу навучання, закладзеных у законе "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Працэс удасканалення пачаўся з распрацоўкі новага вучэбнага плана, які дзейнічае з 1 верасня 1992 г. Вучэбны план уключае шэраг

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыплін, накіраваных на вывучэнне гісторыі Беларусі, яе культуры, літаратуры, мовы, бібліятэчнай справы рэспублікі. Новы вучэбны план распрацаваны на беларускай мове.

Улічваючы, што ў адпаведнасці з Канцэпцыяй развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь змяніліся функцыі публічнай бібліятэкі ў сучасным грамадстве, да асноўнай спецыяльнасці "бібліятэкар-бібліёграф сярэдняй кваліфікацыі публічнай бібліятэкі" ўведзены спецыялізацыі "арганізатар вольнага часу" і "спраўавод", для якіх таксама распрацаваны вучэбныя планы.

Да вучэбных планаў распрацавана адпаведная кваліфікацыйная характарыстыка, у якой сфармуляваны новыя патрабаванні да будучых спецыялістаў.

Змест адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў вызначаецца вучэбнымі праграмамі. Таму паралельна з распрацоўкай вучэбных планаў праведзена распрацоўка вучэбных праграм. Характэрнымі асаблівасцямі новых вучэбных праграм з'яўляюцца напаўненне іх нацыянальным зместам, спасылка на апошнія навуковыя даследаванні альтэрнатыўнага характару як па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах, так і па асноўных спецыяльных дысцыплінах; выкарыстанне лепшага вопыту бібліятэчнай справы бібліятэк рэспублікі, краін Садружнасці і замежных краін. Значная ўвага ў новых вучэбных праграмах удзелена практычнай падрыхтоўцы навучэнцаў.

З 32 вучэбных праграм 25 распрацаваны аўтарскімі калектывамі з ліку выкладчыкаў тэхнікума, 14 вучэбных праграм з 25, а таксама праграмы вучэбнай і вытворчай практык - на беларускай мове.

У мэтах пашырэння прафесійнага кругагляду навучэнцаў тэхнікума ў новы вучэбны план уведзены новыя прадметы, такія як арганізацыя масавых мерапрыемстваў, дакументальныя інфармацыйныя патокі, асновы маркетынгу ў бібліятэчнай справе, бібліятэчная справа за мяжой і інш.

Усе праграмы, распрацаваныя выкладчыкамі тэхнікума, прайшлі рэцэнзаванне на адпаведных кафедрах Беларускага універсітэта культуры, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, атрымалі станоўчыя рэцэнзіі і рэкамендаваны да выкарыстання ў вучэбным працэсе.

Распрацоўка новых вучэбных праграм выклікала неабходнасць абнаўлення зместу лекцыйнага матэрыялу, пошуку новых форм вучэбнай дзейнасці навучэнцаў. Таму ва ўсіх цыклавых камісіях была арганізавана работа па распрацоўцы і абнаўленні зместу лекцый.

Сёння педагагічны калектыў стаіць таксама перад неабходнасцю перааформлення і стварэння новага метадычнага забеспячэння вучэбна-выхаваўчага працэсу. У цыклавых камісіях гэта работа спланавана і паступова ствараецца новы дыдактычны комплекс: раздатачны матэрыял, наглядныя дапаможнікі, структурна-лагічныя схемы, апорныя канспекты, плакаты, тэсты, анкеты, заданні для практычных заняткаў.

Разам з абнаўленнем зместу вучэбных прадметаў педагагічны калектыў працуе над праблемай больш якаснага авалодання ведамі, практычнымі ўменнямі і навыкамі навучэнцамі тэхнікума. Адной з вядучых тэм навукова-метадычнай работы цыклавых камісій у вырашэнні праблемы больш якаснага авалодання ведамі навучэнцамі тэхнікума з'яўляецца комплекснае іх выкарыстанне праз інтэграванне вучэбнага матэрыялу па розных прадметах на падставе ўстанаўлення міжпрадметных сувязей.

Працэс інтэгравання вучэбнага матэрыялу аднаго прадмета ў другі патрабуе выкарыстання на ўроках, акрамя традыцыйных, і новых форм навучання. І ў першую чаргу такіх форм вучэбнай работы, якія будуць накіраваны на арганізацыю самастойнай работы навучэнцаў праз розныя формы як на ўроках, так і ў пазакласнай рабоце, актывізацыю іх пазнавальнай дзейнасці. Таму побач з урокамі-лекцыямі выкладчыкі выкарыстоўваюць розныя формы практычных заняткаў, арганізацыю творчай работы навучэнцаў на ўроках. Да іх ліку трэба аднесці ўрокі-дыялогі, урокі-семінары, вытворчыя сітуацыі, дзелавыя гульні. На ўроках бібліятэказнаўства пры вывучэнні асобных тэм праводзіцца анкетаванне, на ўроках бібліяграфіі - тэсціраванне. Навучэнцы тэхнікума выступаюць з рэфератамі, паведамленнямі аб дзеячах мастацтва, літаратуры, культуры, навукі, гісторыі, аб беларускіх першаасветніках і інш.

Выкладчыкі сацыяльна-гуманітарных навук выкарыстоўваюць і дасканала працуюць з матэрыяламі перыядычных выданняў, якія змяшчаюць матэрыялы альтэрнатыўнага характару, розныя пункты гледжання сучасных вучоных на гістарычныя падзеі і перыяды развіцця чалавечага грамадства, гісторыі Беларусі і беларускага народа.

Шырока выкарыстоўваюцца на ўроках спецыяльных дысцыплін структурна-лагічныя схемы, апорныя канспекты па найбольш складаных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэмах бібліяграфіі, бібліятэказнаўства, фондаў і каталогаў, асновах інфарматыкі. У сучасны момант вядзецца распрацоўка методыкі правядзення комплексных залікаў і курсавых экзаменаў па спецыяльных дысцыплінах, якія з'явяцца этапам завяршэння работы над праблемай інтэгравання вучэбнага матэрыялу аднаго прадмета ў другі.

Трэба адзначыць, што мы імкнемся змяніць характар вучэбнай і вытворчай практык. З гэтай нагоды распрацаваны праграмы практыкі ў адпаведнасці з новымі вучэбнымі праграмамі па спецыяльных дысцыплінах. Галоўнае, на што звяртаецца ўвага, каб навучэнцы мелі ў час практыкі магчымасць займацца непасрэдна абслугоўваннем чытачоў, задавальненнем іх запатрабаванняў, каб яны пастаянна звярталіся да кніжнага фонду бібліятэкі, вывучалі яго састаў, чытацкія запатрабаванні, прымалі ўдзел у інфармацыйнай, даведачна-бібліяграфічнай, масавай рабоце бібліятэкі.

З 1991 г. у мэтах выканання закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і пастановы калегіі Міністэрства культуры рэспублікі па гэтым пытанні ў тэхнікуме вядзецца паступовы перавод вучэбна-выхаваўчага працэсу на беларускую мову навучання. Праведзена частковае пераафармленне вучэбнага корпуса на беларускую мову: бібліятэкі тэхнікума, кабінетаў бібліятэказнаўства, бібліяграфіі, арганізацыі бібліятэчных фондаў і каталогаў. Створаны кабінеты гісторыі Беларусі, беларускай літаратуры. Усё справаводства вядзецца на беларускай мове. Гэта работа будзе працягвацца далей.

Такім чынам, педагагічны калектыў тэхнікума знаходзіцца ў пастаянным творчым пошуку шляхоў удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу. Адным з такіх шляхоў з'яўляецца стварэнне вучэбна-метадычнага комплексу "Магілёўскі бібліятэчны каледж - Беларускі універсітэт культуры". Яго стварэнне дапаможа ажыццяўляць шматузроўневую падрыхтоўку бібліятэчных кадраў для бібліятэк рэспублікі.

Матульскі Р.С.
канд.пед.навук,
ст.выкладчык

## ДА КАНЦЭПЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ВЫШЭЙШАЙ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь па шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын у наш час знаходзіцца ў крызавым стане. Недахопы бібліятэчнай адукацыі адлюстроўваюцца ў практыцы работы бібліятэк рэспублікі, што вядзе да нізкай якасці бібліятэчнага абслугоўвання, зніжэння статуса бібліятэкі ў грамадстве.

З пункту гледжання сістэмнага падыходу бібліятэчная адукацыя ўяўляе сістэму, якая складаецца з 4-х узаемазвязаных элементаў: кантынгенту студэнтаў; прафесарска-выкладчыцкага складу; матэрыяльна-тэхнічнай базы; метадычнага забеспячэння.

Выкладчыкі факультэта могуць эфектыўна ўплываць толькі на 4-ты элемент сістэмы - метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу.

Пры вызначэнні пераліку спецыяльнасцей і спецыялізацый неабходна адмовіцца ад валавай падрыхтоўкі спецыялістаў, арыентаванай на ўсярэдненую публічную бібліятэку, і перайсці да глыбокай спецыялізацыі. У рамках бібліятэчнай адукацыі спецыялізацыя можа развівацца па трох асноўных напрамках: тыпы бібліятэк, віды дакументаў і функцыі дзейнасці.

Асноўнай прыметай, па якой неабходна выдзяляць спецыялізацыі на факультэце, з'яўляецца функцыянальная накіраванасць дзейнасці. Зыходзячы з гэтага, можна выдзеліць наступныя асноўныя спецыялізацыі:

– спецыяліст па фармаванню бібліятэчнага фонду (тэкставых баз дадзеных):

– спецыяліст па аналітыка-сінтэтычнай апрацоўцы дакументаў і фармаванню бібліяграфічных баз дадзеных;

– спецыяліст па абслугоўванню карыстальнікаў;

– спецыяліст па мэнеджмэнту і маркетынгу.

Дадзены пералік спецыялізацый пры неабходнасці можа быць дапоўнены і дэталізаваны.

Працэс навучання павінен уключаць 4 блокі вучэбных дысцыплін: агульнанавуковыя дысцыпліны, якія вывучаліся да паступлення ў ВНУ;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ